Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
____________________С.Л.Шпарло
_25_ _февраля_____2024г.
Рэгістрацыйны № ВД-6-83/эвуч.

# ВЫКАНАЛЬНІЦКАЕ МАЙСТЭРСТВА

*вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей*
6-05-0215-09 Харавая творчасць,
прафілізацыі: Харавая музыка народная
6-05-0215-08 Мастацтва народных спеваў
прафілізацыі: Сольнае выканальніцтва

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0215-09 Харавая творчасць, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21 жніўня 2023 г. № 270, вучэбнага плана БДУКМ па спецыяльнасці.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*І.М.Грамовіч,* дэкан факультэта музычнага і харэаграфічнага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Н.В.Кользун,* дырэктар Палаца культуры Мінскага трактарнага завода;

*Н.І. Дожына,* загадчык кафедры тэорыі музыкі і музычнай адукацыі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (пратакол № 6 ад 30.01.2024);

*прэзідыумам* навукова-метадычным саветам установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 3 ад 21.02.2024).

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна “Выканальніцкае майстэрства” займае адно з важных месцаў у комплексе вучэбных дысцыплін, накіраваных на падрыхтоўку кіраўнікоў народнага хару і фальклорных ансамбляў, артыстаў-вакалістаў, выканаўцаў народнай песні. Гэта адна з галоўных прафіліруючых вучэбных дысцыплін, засваенне якой дапамагае падрыхтаваць высокаадукаванага спецыяліста.

Практычная работа ў класе па “Выканальніцкаму майстэрству” накіравана на набыццё ведаў па вакальна-харавым, харэаграфічным, музычным і акцерскім майстэрстве. Вучэбны працэс пабудаваны ва узаемадзеянні з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі, якія ўдасканальваюць прафесійныя навыкі і веды студэнтаў. Сярод іх “Гуртавыя спевы”, “Пастаноўка голасу”, “Сольныя спевы”, “Харавы клас”, “Асновы сцэнічнага руху”, “Асновы дырыжыравання”, “Акцерскае майстэрства” і інш. Змест вучэбнай дысцыпліны прадугледжвае сістэматычнае і паслядоўнае засваенне асноў практыка-выканальніцкіх уменняў і навыкаў .

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны “Выканальніцкае майстэрства” – даць будучаму спецыялісту неабходныя веды ў вобласці народна-песеннага выканальніцтва, асаблівасцей фальклорных традыцый, акцёрскага і педагагічнага майстэрства, сцэнічнай інтэрпрэтацыі народнай песні.

Асноўныя *задачы* вучэбнай дысцыпліны:

-удасканальванне навыкаў і прыёмаў народна-песеннага выканальніцтва;

-захаванне рэгіянальных традыцый харавых і сольных спеваў;

-асваенне асноўных прыёмаў малюнка танца ў спалучэнні з тэкстам песні;

-набыццё вопыта канцэртных выступленняў.

У выніку навучання студэнт павінен *ведаць*:

- вакальна-харавую, музычную і танцавальную культуру Беларусі;

- асаблівасці школы народных спеваў;

-народна-песенныя календарна-абрадавыя і пазаабрадавыя традыцыі;

-прынцыпы работы над народнай песняй і асаблівасцямі рэпетыцыйнага працэсу;

-асновы сцэнічных рухаў.

*умець:*

-ужываць тэарэтычныя веды, выканальніцкія і музычна-педагагічныя уменні і навыкі ў практычнай дзейнасці;

-прафесійна валодаць майстэрствам ансамблевых, харавых і сольных спеваў;

-карыстацца каардынацыяй спеваў і рухаў;

-свабодна трымацца на сцэнічнай пляцоўцы;

-працаваць над вакальна-харэаграфічнымі кампазіцыямі па матывах каляндарнага і пазаабрадавага цыклаў;

-выкарыстоўваць мастацкія сродкі выканання ў адпаведнасці са стылёвымі асаблівасцямі беларускай народнай песні;

-выразна і дасканала даносіць змест вакальнага твора да гледача ва ўмовах канцэртных выступаў;

-ажыццяўляць рэжысуру канцэртнага нумару.

*валодаць:*

-метадамі і прыёмамі кіравання рэпетыцыйным працэсам у фальклорных калектывах, народных харах, сольным выканальніцтве;

-комплексам сродкаў выканальніцкай выразнасці;

-тэарэтычнымі і выканальніцкімі метадамі аналіза рэпертуара;

-слыхавым кантролем для кіравання працэсам выканання;

-сродкамі выканальніцкай выразнасці для правільнай інтэрпрэтацыі выконваемых твораў;

-педагагічным і канцэртным рэпертуарам, здольнасцю яго самастойнага вывучэння і падбору;

-развітымі сцэнічна-выканальніцкімі якасцямі.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Выканальніцкае майстэрства” ў студэнтаў спецыяльнасці 6-05-0215-09 Харавая творчасць, прафілізацыі: Харавая музыка народная накіравана на фарміравнне базавай прафесійнай кампетэнцыі:

БПК-11. Выкарыстоўваць сродкі мастацкай выразнасці для рэалізацыі прафесійных творчых замыслаў, веды і навыкі арыентацыі ў сцэнічнай прасторы, культуры сцэнічных паводзін, сцэнічнага касцюма і вобраза, характэрных для народнага хору.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Выканальніцкае майстэрства” ў студэнтаў спецыяльнасці 6-05-0215-08 Мастацтва народный спеваў прафілізацыі: Сольнае выканальніцтва накіравана на фарміраванне ўніверсальных і базавай прафесійнай кампетэнцый:

УК-5. Быць здольным да самаразвіцця і самаўдасканалення ў прафесійнай дзейнасці, працаваць самастойна, разумець месца і ролю сваёй прафесіі ў сучаснай сацыякультурнай прасторы;

УК-6. Праяўляць ініцыятыву і адаптавацца да зменаў у прафесійнай дзейнасці;

УК-11. Увасабляць культурна-асветніцкія ідэі праз прафесійную дзейнасць;

БПК-6. Выконваць сачыненні розных формаў, стыляў і жанраў, ствараючы іх мастацкую інтэрпрэтацыю.

У адпаведнасці з вучэбным планам па вучэбнай дысцыпліне “Выканальніцкае майстэрства” па спецыяльнасці: 6-05-0215-09 Харавая творчасць, прафілізацыі: Харавая музыка народная усяго прадугледжана 558 гадзін, з якіх 200 аўдыторныя (106 – практычныя, 94 – індывідуальныя) заняткі, па спецыяльнасці 6-05-0215-08 Мастацтва народный спеваў прафілізацыі: Сольнае выканальніцтва усяго прадугледжана 1484 гадзін, з якіх 770 аўдыторныя (практычныя) заняткі.

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залікі, экзамены.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Уводзіны

Мэты і задачы вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Выканальніцкае майстэрства”. Вучэбная дысцыпліна “Выканальніцкае майстэрства“ сярод іншых вучэбных дысцыплін, межпрадметныя сувязі. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне.

### Тэма 1. Асаблівасці тэхналогіі народнай манеры спеваў

Народная манера спеваў як комплекс вакальна-выканальніцкіх сродкаў і прыёмаў. Спеўнае дыханне. Дыкцыя, дакладнае і выразнае вымаўленне тэксту. Засваенне правільнага гукаўтварэння. Выпрацоўка адзінай манеры спеваў. Авалодванне навыкамі спеваў у міксґавым і галаўным рэгістрах. Згладжванне і спалучэнне рэгістраў. Спецыфічныя формы выразнасці спеваў. Выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі. Асаблівасці інтанавання меладычных і гарманічных гукаспалучэнняў.

### Тэма 2. Засваенне практычных навыкаў народна-песеннага выканальніцтва

Метады развіцця галасавога апарата. Распяванне, як аснова фарміравання пеўчых навыкаў. Работа над дыкцыяй, тэмбрам, асаблівасцямі рытма-акцэнтнай арганізацыі песеннага тэкста. Песенная ўстаноўка. Харавы строй, ансамбль. Дакладная перадача мелодыі, рытму, гукавысотнасці, фразіроўкі. Навыкі ансамблевага, харавога і сольнага выканання. Дакладнае інтанаванне пэўных меладычных і гарманічных спалучэнняў. Падрыхтоўчая работа і авалодванне навыкамі для запісаў песеннага матэрыялу ў гуказапісываючай студыі. Работа з акампанементам.

### Тэма 3. Выкарыстанне сродкаў выканальніцкага майстэрства, як асновы стварэння мастацкага вобраза.

Ужыванне выразных сродкаў пры выкананні народнай песні. Работа над нюансамі і дынамічнымі адценнямі: piana, pianissimo, forte, sp і інш. Філіроўка гуку. Работа над тэмпамі у песне. Простыя і складаныя памеры. Работа над штрыхамі: legata, non letgata, staccato, marcata. Ужыванне акцёрскага майстэрства для перадачы сэнса беларускай народнай песні і аўтарскага твора. Асноўныя прынцыпы стварэння мастацкага вобраза. Стварэнне сцэнічных вобразаў. Каардынацыя спеваў з адначасовым выкананнем жэстаў, рухаў, элементаў харэаграфіі.

### Тэма 4. Спецыфіка работы над музычна-харэаграфічным суправаджэннем песеннага фальклора

Беларускі народны танец і выкарыстанне яго элементаў у народнай песне. Выкарыстанне элементаў сучаснай харэаграфіі ў народнай песне. Прынцыпы развіцця пластыкі, суадносіны рытму, руху і характара танцавальнага шага. Выкарыстанне касцюмаў, бутафорыі і інш.

Узаемасувязь харэаграфіі з інструментальным суправаджэннем і песенным матэрыялам. Спецыфіка выканання народных песень з элементамі традыцыйнай народнай харэаграфіі. Засваенне асноўных элементаў беларускага народнага танца і яго выкарыстанне у сцэнічнай інтэрпрытацыі народнай песні. Работа над вакальна-харэаграфічнымі кампазіцыямі па матывах народных каляндарана-абрадавых и пазаабрадавых песень.

### Тэма 5. Авалоданне майстэрствам імправізацыі

Роля імправізацыі ў сольным і харавым народна-песенным выканальніцтве. Імправізацыя, як адзін са шляхоў развіцця вакальных і творчых здольнасцей спевакоў. Авалодванне навыкамі распеваў на некалькі галасоў у фальклорным калектыве. Прыёмы развіцця музыкальнага слыху і слыхавога ўспрыяцця. Спевы "з падводкай". Спевы "з пералівамі". Народная паліфанія. Развіццё навыкаў ансамблевых спеваў: двухгалоссе, трохгалоссе, чатырохгалоссе і інш.

### Тэма 6. Засваенне рэгіянальных народна-песенных выканальніцкіх традыцый

Вывучэнне і перайманне асаблівасцей рэгіянальных народна-песенных традыцый. Аўтэнтычная манера спеваў. Сувязь народнай манеры спеваў з асаблівасцямі дыялекту, музычнай мовы і выканальніцкага вопыту пакаленняў народных спевакоў адной мясцовасці. Засваенне аўтэнтычнай, адкрытай манеры спеваў. Набыццё навыкаў і уменняў выканання вакальных упрыгожванняў: глісандзіраванне, спады голасу, скідванне, пад'езды гуку, слізганні, зацягванне апошняга гука, вымаўленне апошняга гука гаваркам і інш. Прынцыпы вывучэння народных пеўчых традыцый календарна-абрадавага і пазаабрадавага цыклаў. Выкананне народных песень з ужываннем рэгіянальнай гаворкі. Выкарыстанне спецыфічных вымаўленчых прыёмаў пры развучванні паэтычнага тэксту народных песень.

### Тэма 7. Выкарыстанне песеннага матэрыялу ў практыцы выканаўцаў народнай песні. Прынцыпы падбору рэпертуару.

Розныя формы вывучэння песеннага матэрыялу. Выкананне ўзораў стылізаванага і аўтэнтычнага фальклору, твораў беларускіх кампазітараў для народнага голасу. Засваенне народнай песні без суправаджэння і з акампанементам, пад фанаграму( -1). Апрацоўкі народных песень. Аўтарскія творы для народнага голасу. Ужыванне прынцыпаў падбору вучэбнага і канцэртнага рэпертуару для ансамблевага і сольнага выканальніцтва. Дыферэнцыраваны падыход у выбары рэпертуару. Прынцып разнастайнасці тэматыкі і ступені складанасці.

### Тэма 8. Вывучэнне спецыфікі харэаграфічных пастановак вакальнага твора

Авалодванне навыкамі танцавальных рухаў. Спецыфіка выкарыстання харэаграфічных малюнкаў у пастаноўцы народнай песні. Набыццё навыкаў і

ўменняў харэаграфічнага рашэння аўтарскага твора. Пабудова танцавальнага малюнку ва ўзаемасувязі з тэкстам народнай песні. Сцэнічная пастаноўка канцэртнага нумару выканаўца народнай песні. Замацаванне навыкаў выканання беларускіх абрадаў і вакальна-харэаграфічных кампазіцый.

**Тэма 9. Інтэрпрэтацыя беларускай народнай песні і яе сцэнічнае вырашэнне**

Выкарыстанне і работа з фальклорным і аўтарскім музыкальна-песенным матэрыялам. Работа з харавымі аўтарскімі творамі. Рэжысура канцэртнага нумару і стварэнне канцэртнай праграмы: ідэйная накіраванасць, развіццё агульнай драматургічнай лініі, завязка, кульмінацыя і фінал, лагічнае выкарыстанне харэаграфіі і персанажаў народных абрадаў. Выкарыстанне жэстаў, рухаў у пастановачнай рабоце народнай песні. Пастаноўка вакальна-харэаграфічных кампазіцый. Асаблівасці работы з народным абрадавым дзеяннем. Прынцыпы арганізацыі і сцэнічнае рашэнне канцэртнага нумару, сольнага канцэрта, творчага паказу. Распрацоўка канцэртнай праграмы.

**Тэма 10. Практыка канцэртнай дзейнасці**

Канцэртная дзейнасць і прынцыпы яе арганізацыя. Значнасць канцэртнай дзейнасці для прафесійнага развіцця выканаўцаў народнай песні. Сродкі пераадолення сцэнічнага хвалявання. Псіхолага-педагагічнае станаўленне выканаўцаў. Асветніцкая і прапагандысцкая дзейнасць народна-песенных калектываў і сольных выканаўцаў.

**Тэма 11. Арганізацыя самастойнай работы**

Прынцыпы арганізацыі самастойнай работы. Распрацоўка сцэнарнага плана і этапы правядзення рэпетыцыі. Падбор рэпертуару. Пошук мастацкай інтэрпрэтацыі музычных твораў. Работа над выканальніцкім майстэрствам і мастацкім вобразам. Самастойны пошук і выкарыстанне выканальніцкіх сродкаў для перадачы мастацкага вобраза народнай песні. Работа над якасцю гукаўтварэння. Работа з творамі з музычным суправаджэннем. Пастаноўка нумароў з танцавальнымі рухамі. Падрыхтока матэрыялаў для іх засваення ў фальклорным ансамбле, сольным выканні: аналіз і абмеркаванне, выбар і замацаванне. Самастойная расшыфроўка і апрацоўка аўтэнтычных узораў народнай песні. Адзнака дзейнасці розных творчых калектываў. Прагляд и знаёмства з аўдыё- і відыё- матэрыяламі фальклорных фестываляў, канцэртаў, конкурсаў, запісаў матэрыялаў экспедыцый, містар-класаў. Перайманне вопыту вядучых спецыялістаў у вобласці народна-песеннага выканальніцтва.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

спецыяльнасці
6-05-0215-09 Харавая творчасць
прафілізацыі: Харавая музыка народная

| № | Назва тэмы, раздзела | Колькасць аудыторных гадзін | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | Практычныя | КСР | |
| 1. | Уводзіны | 1 | | |
| 2. | Асаблівасці тэхналогіі народнай манеры спеваў | 10 | 6 | тэхнічны залік |
| 3. | Засваенне практычных навыкаў народна-песеннага выканальніцтва | 20 | 4 | творчы паказ |
| 4. | Выкарыстанне сродкаў выканальніцкага майстэрства, як асновы стварэння мастацкага вобраза | 20 | 6 | тэхнічны залік |
| 5. | Спецыфіка работы над музычна-харэаграфічным суправаджэннем песеннага фальклору | 20 | 4 | творчае заданне |
| 6. | Авалоданне майстэрствам імправізацыі | 10 | 4 | творчы паказ |
| 7. | Засваенне рэгіянальных народна-песенных выканальніцкіх традыцый | 10 | 4 | творчы паказ |
| 8. | Выкарыстанне песеннага матэрыялу ў практыцы выканаўцаў народнай песні. Прынцыпы падбору рэпертуару | 10 | 2 | творчае заданне |
| 9. | Вывучэнне спецыфікі харэаграфічных пастановак вакальнага твора | 19 | 6 | творчы паказ |
| 10. | Інтэрпрэтацыя беларускай народнай песні і яе сцэнічнае вырашэнне | 10 | 2 | творчае заданне |
| 11. | Практыка канцэртнай дзейнасці | 20 | 2 | творчы паказ |
| 12. | Арганізацыя самастойнай работы | 10 | | |
| | **Усяго 200** | **160** | **40** | |

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧ НАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

спецыяльнасці
6-05-0215-08 Мастацтва народный спеваў
прафілізацыі: Сольнае выканальніцтва

| № | Назва тэмы, раздзела | Колькасць аудыторных гадзін | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | Практычныя | КСР | |
| 1. | Уводзіны | 1 | | |
| 2. | Асаблівасці тэхналогіі народнай манеры спеваў | 90 | 10 | тэхнічны залік |
| 3. | Засваенне практычных навыкаў народна-песеннага выканальніцтва | 70 | 10 | творчы паказ |
| 4. | Выкарыстанне сродкаў выканальніцкага майстэрства, як асновы стварэння мастацкага вобраза | 60 | 16 | тэхнічны залік |
| 5. | Спецыфіка работы над музычна-харэаграфічным суправаджэннем песеннага фальклору | 50 | 16 | творчае заданне |
| 6. | Авалоданне майстэрствам імправізацыі | 50 | 14 | творчы паказ |
| 7. | Засваенне рэгіянальных народна-песенных выканальніцкіх традыцый | 50 | 16 | творчае заданне |
| 8. | Выкарыстанне песеннага матэрыялу ў практыцы выканаўцаў народнай песні. Прынцыпы падбору рэпертуару. | 50 | 14 | творчы паказ |
| 9. | Вывучэнне спецыфікі харэаграфічных пастановак вакальнага твора | 50 | 16 | творчы паказ |
| 10. | Інтэрпрэтацыя беларускай народнай песні і яе сцэнічнае вырашэнне | 40 | 18 | творчае заданне |
| 11. | Практыка канцэртнай дзейнасці | 60 | 10 | творчы паказ |
| 12. | Арганізацыя самастойнай работы | 49 | 10 | тэхнічны залік |
| | **Усяго: 770** | **620** | **150** | |

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

спецыяльнасці
6-05-0215-09 Харавая творчасць
прафілізацыі: Харавая музыка народная
завочная форма атрымання адукацыі

| № | Назва тэмы, раздзела | Колькасць гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | Аўдыторныя | КСР |
| 1. | Уводзіны | 1 | |
| 2. | Асаблівасці тэхналогіі народнай манеры спеваў | 5 | 11 |
| 3. | Засваенне практычных навыкаў народна-песеннага выканальніцтва | 2 | 22 |
| 4. | Выкарыстанне сродкаў выканальніцкага майстэрства, як асновы стварэння мастацкага вобраза | 5 | 21 |
| 5. | Спецыфіка работы над музычна-харэаграфічным суправаджэннем песеннага фальклору | 3 | 21 |
| 6. | Авалоданне майстэрствам імправізацыі | 5 | 9 |
| 7. | Засваенне рэгіянальных народна-песенных выканальніцкіх традыцый | 5 | 9 |
| 8. | Выкарыстанне песеннага матэрыялу ў практыцы выканаўцаў народнай песні. Прынцыпы падбору рэпертуару | 5 | 7 |
| 9. | Вывучэнне спецыфікі харэаграфічных пастановак вакальнага твора | 4 | 21 |
| 10. | Інтэрпрэтацыя беларускай народнай песні і яе сцэнічнае вырашэнне | 5 | 7 |
| 11. | Практыка канцэртнай дзейнасці | 4 | 18 |
| 12. | Арганізацыя самастойнай работы | 2 | 8 |
| | **Усяго: 200** | **46** | **154** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

Літаратура

Асноўная

1. Грамовіч, І.М. Народны спеў: вучэб.метад. дапам./І.М.Грамовіч, Я.Я. Дзеравянка; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. Дзярж.ун-т культуры і мастацтваў.-Мінск:БДУКМ, 2020.-116с.

2. Дмитриев, Л.Б. Основы вокальной методики / Л.Б. Дмитриев.---М .: Музыка, 2000.—367 с.

3. Калугина, Н.В. Методика работы с русским народным хором: учеб. для муз. вузов / Н.В. Калугина. — М.: Музыка, 1977. – 256 с.

4. Малышева, Н.М. О пении / Н.М. Малышева. —М.: Сов. композитор,1988.—135с. 5. Мешко, Н.К. Искусство народного пения. Практическое рук-во и методика обучения искусству народного пения / Н.К.Мешко.— М.: ЛУЧ.—Ч . 2.—2000 .—80 с.17.

6.Руднева, А.В. Русский народный хор и работа с ним / А.В. Руднева. – М.: Сов. Россия, 1974. -- 49 с.

7. Савельева, В.П. Проблемы вокального обучения руководителей народных хоров / В. П. Савельева // Вопросы хорового образования: Сб. тр. / М-во культуры РСФСР, Гос. Муз.-пед. ин-т. – М., 1985. – Вып. 77. -- 120 с .

8. Шамина, Л.В. Работа с самодеятельным хоровым коллективом / Л. В. Шамина.—М.: Музыка,1983.—176 с.

Дадатковая

1. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.1. Магілёўскае Падняпроўе / Т.Б. Варфаламеева, В.І. Басько, М.А. Козенка і інш.—Мн.: Бел. навука, 2001.—797с.

2. Жартоўныя песні / рэд. А.С. Фядосік.— Мн.:Навука і тэхніка, 1974.—340с.

3. Жніўныя песні / рэд. А.С. Фядосік.— Мн.: Навука і тэхніка, 1974.— 348с.

4. Мажэйка, З.Я. Песні Беларускага Паазер'я / З. Я. Мажэйка. —Мн.: Навука і тэхніка, 1981.— 493с.

5. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / укл. В.А. Захарава, Р.М. Кавалёва, В.Д. Ліцвінка. – Мн . : Універсітэцкае, 1989.—384 с.

6. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / укл. В.Д. Ліцвінка, Г.Д. Кутырова. – Мн .: Універсітэцкае, 1995.—250 с.

7. Варфаламеева, Т. Б. Песні беларускага Панямоння / Т.Б.Варфаламеева.— Мн.: Бел.навука, 1980.— 220с.

8. Варфоломеева Т.Б. Северобелорусская свадьба / Т.Б.Варфаламеева. — Мн.:Наука и техника, 1988.—154с.

9. Веснавыя песні / рэд. К.П. Кабашнікаў.— Мн .: Навука і тэхніка, 1979.— 608 с.

10. Вянок беларускіх народных песень / запіс У. Раговіча.— Мн.: Навука і тэхніка,1988.—432с.

11. Вяселле: Абрад / укл. К.А. Цвірка.— Мн.: Бел. навука,—2004.— 683с.

12. Гульні, забавы, ігрышчы / укл. А.Ю. Лозка.—Мн.:Бел.навука, 2003.—534с.

## Метадычныя ўказанні па арганізацыі самастойнай работы

Самастойная работа па дысцыпліне «Выканальніцкае майстэрства» уключае вывучэнне вакальна-харавога матэрыялу і складаецца з наступных этапаў:

– разбор вакальна-харавога твору;

-вывучэнне стылістыкі, жанравай прыналежнасці песні;

--вывучэнне партый напамяць;

– стварэнне плана па ўвасабленню мастацкага вобраза;

– знаходжанне сцэнічнага вырашэння песеннага матэрыялу.

Пачатковы этап работы прадугледжвае зоркавы агляд твора: выяўленне танальнасці, фактуры ізлажэння, памеру, тэмпу, асаблівасцей голасавядзення, музычнай формы, дыяпазону вакальных партый, цесітуры, дынамічных адценняў, характару, асаблівасцей і сэнсу літаратурнага тэксту. Наступны этап работы заключаецца ў вывучэнні стылістычных асаблівасцей, выяўленні рэгіянальнай прыналежнасці народнай песні. На трэцім этапе студэнты павінны вывучыць вакальныя партыі напамяць з асэнсаваннем літаратурнага тэксту народнай ці аўтарскай песні. Неабходна самастойна дакладна праінтаніраваць мелодыю, вызначыць яе характар і кульмінацыйныя моманты, вакальныя і стылістычныя цяжкасці выканання, раставіць дыханне, фразіроўку, вызначыць дыкцыённыя асаблівасці, лагічныя націскі. Апошні этап прадугледжвае сцэнічнае вырашэнне твора, стварэнне харэаграфічных пастановак і рэалізацыяй на канцэртнай пляцоўцы.

## Сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Асноўнымі сродкамі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці па вучэбнай дысцыпліне “Выканальніцкае майстэрства” з'яўляюцца:

- творчае заданне;

-тэхнічны залік;

-творчы паказ.